©БрГУ

# АКЦЕНТОЛОГИЯ СОВРЕМЕННОГО РУССКОГО ЯЗЫКА: ЗАКОНОМЕРНОСТИ И ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ

***О.В. ЧАБУРКО*, О.А. ФЕЛЬКИНА**

In the research «Accentology of the modern Russian language: regularities and tendencies of development» accentological variants of pronunciation both usual and potentially probable words (quasiwords) in groups of different ages and formation are studied. The relation between accentology and morphemic structure of the word is emerged experimentally, based on the analysis of the level of formation of orthoepic skills of Russian enunciation among different social groups and typology of orthoepic mistakes and accentological design of quasiwords. The factors, which influence the choice of stress option, are also determined in the research

Ключевые слова: ударение, акцентология, произносительная норма

Целью данного исследования было установление закономерностей и тенденций развития современной русской акцентологии на основе анализа степени сформированности орфоэпических навыков русской речи в различных социальных группах, типологии орфоэпических ошибок и акцентологического оформления квазислов.

Научная новизна работы состоит в том, что в ней впервые предпринята попытка установить акцентологические закономерности, выявить зависимость между акцентологией и морфемным составом слова экспериментальным путем. Нами был проведен следующий эксперимент: студентам и школьникам предлагался список квазислов, сконструированных по типичным словообразовательным моделям (ножчатый от нож и др.), респонденты должны были расставить ударения.

На основе анализа результатов эксперимента с различными группами информантов были выявлены следующие факторы, влияющие на выбор варианта ударения: профессиональное образование; аналогия (на выбор ударения влияет родственное или формально сходное слово); в грамматически несущественных позициях срабатывает закон экономии речевых усилий (слово легче произносится с выделением первого, а не последующих слогов); тенденция к ритмическому равновесию; частотность слова; закрепленные в детстве произносительные стереотипы; морфемная структура слова и его внутренняя форма.

На основе анализа слов с суффиксами -ений, -щик, -ат/-чат, -ств, как узуальных, так и окказиональных, были установлены закономерности постановки ударения в зависимости от словообразовательной модели. Так, в существительных с -ений ударение в подавляющем большинстве случаев размещается на первом слоге суффикса (около 94 % слов), для суффикса -щик, напротив, ударение нехарактерно (ударный суффикс только в 6,8 %). Последний аффикс бывает ударным, если в производящей базе (причем неглагольной) ударение падает на последнюю морфему. Прилагательные с суффиксами -ат/-чат акцентологически различаются: суффикс -ат без элемента -ч всегда ударный, в словах с элементом -ч ударение чаще всего выделяет корень. Ударение выделяет суффикс -ат, потому что он является носителем главной особенности внутренней формы слова: например, нос есть у всех, но человек, названный носатым, явно имеет какой-то особый нос, т. е. суффикс -ат как бы заставляет нас обратить внимание на нос этого человека. У прилагательных с элементом -ч значение суффикса оказывается не столь важным. Следовательно, гораздо нужнее выделение корня. Слова с суффиксом -ств (-еств, -тельств, -овств) в большинстве случаев сохраняют ударение производящей базы, только 25 из 1070 слов имеют ударение на флексии, эти слова достаточно старые, в них сохранился более древний произносительный вариант.

Результаты исследования используются в практике преподавания дисциплины «Современный русский язык» на филологическом факультете Учреждения образования «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина», а также могут быть использованы для дальнейших научных исследований в области акцентологии, социофонетики, сравнительного белорусско-русского языкознания.

©БрДУ імя А. С. Пушкіна

# ДА ПЫТАННЯ СТАНАЎЛЕННЯ АЛЬБОМНАЙ ТРАДЫЦЫІ ВАЙСКОЎЦАЎ

***Ю.М. ЧАРНАВОКАЯ*, І.А. ШВЕД**

The main stages of written folklore army are mentioned in the article. The Album is regarded as the main form of fixation of folklore army environment. The themes and issues of album texts of certain periods are designated there

Ключвыя словы: фальклор вайскоўцаў, альбомная традыцыя, салдацкі і дэмбельскі альбомы, станаўленне

Фальклор вайскоўцаў – разнастайны, прадстаўлены ў розных відах і формах. Альбом – асноўная форма фіксацыі фальклору вайсковага асяроддзя, якая характарызуецца наяўнасцю дзвюх разнавіднасцей – альбомы салдацкі (скіраваны на ўнутраны, вайсковы калектыў) і дэмбельскі (скіраваны на знешняе, пазаармейскае асяроддзе). Гісторыя пісьмовага фальклору вайскоўцаў, у ад-

розненне ад вуснага, не даследавана па прычыне крайняй «беднасці» таго матэрыялу, які захаваўся да нашага часу. Дакладна вядома толькі тое, што ў час Першай сусветнай вайны некаторыя салдаты заводзілі песеннікі. У нашыя дні захаваліся шматлікія франтавыя альбомы і песеннікі часоў Вялікай Айчыннай вайны. Песенныя творы гэтага перыяду прасякнуты гераізмам, самаахвярнасцю дзеля Радзімы, камуністычнай партыі. Альбом вайскоўцаў працягваў развівацца на працягу ўсяго савецкага і постсавецкага часу. Вылучаюцца наступныя этапы развіцця альбома:

- сярэдзіна 1960-х – сярэдзіна 1970-х гадоў – станаўленне сучаснай альбомнай традыцыі вайскоўцаў. Салдат у такіх альбомах паказаны як гераічны абаронца Айчыны, служба ў арміі – як «святы абавязак». На такую інтэрпрэтацыю арміі, на нашу думку, моцна паўздзейнічалі метад сацрэалістычнага паказу рэчаіснасці і тэорыя бесканфліктнасці;
- канец 1970-х – пачатак 1980-х гадоў – пераломны этап, які характарызуецца аспрэчваннем некаторых шаблонаў на старонках альбомаў, пэўнымі нававядзеннямі, звязанымі з новымі палітычнымі, сацыяльна-эканамічнымі, культурнымі рэаліямі;
- сярэдзіна 1980-х – 1991-ы год – этап класічнага альбома – у альбомах менавіта гэтага перыяду салдат, які адслужыў у арміі, выяўлены як носьбіт «маскуліннасці і мужчынскай самасвядомасці», адносна шырока прадстаўлены нестатутныя ўзаемаадносіны ў войску;
- 1991-ы год – канец 1990-х – пераважна іранічнае стаўленне да арміі, аднак вобраз салдата, які адслужыў, набывае ярка выражаныя гендарныя прыкметы;
- канец 1990-х гадоў – пачатак 2000-х – функцыю дэмбельскага альбома часткова пачаў выконваць салдацкі альбом: на яго старонках разам з пісьмовымі вершаванымі і празаічнымі тэкстамі часцей пачалі з’яўляцца ілюстрацыі, што раней было не ўласціва для салдацкага альбома. Адзначым, што тэматыка вербальных і візуальных тэкстаў дэмбельскага альбома, у параўнанні з альбомамі, што вяліся пачынаючы з канца 1980-х гадоў, не змянілася;
- сучасны (віртуальны) альбом. Са з’яўленнем і шырокім доступам да новай платформы ўзаемадзеяння людзей – сусветнай камп’ютарнай сеткі Інтэрнэт – спосаб прэзентацыі фальклору вайскоўцаў змяніўся. Віртуальны альбом, на нашу думку, лепш выконвае адну з галоўных функцый альбома як такога – камунікатыўную – доступ да старонкі атрымліваюць усе карыстальнікі Сеткі, на старонцы можа ладзіцца жывы дыялог паміж «госцем» і «ўладальнікам», наведвальнікі могуць пакідаць свае каментары да змешчанай інфармацыі. Уладальнік Інтэрнэт-альбома мае магчымасць лёгка знаходзіць новых «сяброў» у розных гарадах і краінах.Нягледзячы на шырокую камп’ютарызацыю, альбом захаваў спецыфіку рукапіснага арыгінала (жанравы склад, кампазіцыйную арганізацыю, традыцыі графічнага афармлення), але пры гэтым набыў новыя формы (аўдыя-, відэа-).

З гэтага па неабходнасці сціслага і далёка не вычарпальнага агляду бачна, што салдацкі альбом як асноўная форма фіксацыі фальклору вайсковага асяроддзя прайшоў доўгі шлях эвалюцыі. Сёння разгляданы альбом застаецца актуальным фактам субкультуры вайскоўцаў і аб’ектам цікавасці «*на гражданке*».

©БДУ

## УСКЛАДНЕННЕ НАРАТЫЎНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ Ў ТВОРАХ М. ГАРЭЦКАГА, К. ЧОРНАГА, В. КАЗЬКО

***І.Ч. ЧАСНОК***, **Л.Д. СІНЬКОВА**

The article provides with the following ways of narrative organization’s complexity of artistic text: indirect speaking in the novel «Wilno Communards» by M. Garetsky, reinterpretation of category eventfulness in the novel «Sister» by K. Chorny, separation and external destruction in the narrative «Save us and show mercy to us, black stork» and in the novel «Chronicle of children’s home garden» V. Kazko

Ключавыя словы: наратыўная стратэгія, непрамое маўленне, пункт гледжання, унутраная падзейнасць, ускладненая наратыўная арганізацыя

У XX стагоддзі беларускімі пісьменнікамі ў асноўным ствараліся тэксты з традыцыйнай наратыўнай арганізацыяй, аднак былі створаны тэксты і з ускладненай.

М. Гарэцкі ў рамане «Віленскія камунары» (1931-1932) шукаў і знайшоў спосаб выяўлення ідэй непрамым шляхам. Пісьменніцкая інтэнцыя падпарадкоўвае нарацыю ў творы. Наратар Мышка валодае меншай кампетэнтнасцю ў параўнанні з наратарам больш высокага ўзроўню (другой свядомасцю ў тэксце), мае своеасаблівую манеру аповеду. Асаблівую ўвагу ў рамане М. Гарэцкага звяртаюць на сябе ідэалагічныя пункты гледжання персанажа-апаведача і наратара найвышэйшай ступені – яны не супадаюць, і гэта выяўляецца ў тэксце найперш праз іронію. Каб зразумець задуму рамана, неабходна звяртаць увагу і на «прыхаваныя» пункты гледжання, з дапамогай якіх у творы рэалізуецца наратыўная стратэгія – устаноўка на непрамое маўленне. М. Гарэцкі ўпершыню ў беларускай літаратурнай традыцыі стварыў надзвычай разгалінаваны і шматузроўневы па